# УЛІК НАЦЫЯНАЛЬНЫХ І АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У РАСПРАЦОЎЦЫ ПРАФЕСІЙНЫХ СТАНДАРТАЎ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

М.М.Каралеў

Сучасная сацыя-культурная сітуацыя, кільнай патрэбнасці адраджэння беларускай нацыянальнай культуры, паставілі на першае месца задачу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для сферы культуры. Асноўнымі праблемамі, якія не дазваляюць у поўнай меры рэалізаваць поўную мэту з'яўляюцца:

1. Нераспрацаванасць тэарэтычнай канцэпцыі развіцця культуры ва ўмовах рынку;

2. Адставанне існуючай метадалогіі і структуры вышэйшай школы ад міжнароднага вопыту падрыхтоўкі спецыялістаў сацыя-культурнай сферы;

3. Адсутнасць канкрэтнага сацыяльнага заказу на падрыхтоўку спецыялістаў для сферы культуры як на бліжэйшы час так і на перспектыву.

Зыходзячы з вышэй сказанага і ўсведамляя, што развіцце культуры ўяўляецца сення прыярытэтным накірункам адраджэння і духоўнага аб'яднання нацыі, а таксама сродкам увахода ў сусветную цывілізацыю, пераадолення крызісу існуючай сістэмы культуралагічнай адукацыі бачыцца:

- у адмаўленні ад неапраўдаўшых сябе стэрэатыпаў культурна-асветніцкай адукацыі, адраджэння нацыянальных форм традыцыйнай культуры і агульначалавечых каштоўнасцей;
- карэннай змене структуры ВНУ, пераход ад негібкіх існуючых падраздзяленняў (кафедры, прадметна-метадычныя камісіі) да якасна новых накірункаў аўтарскай педагогікі (творчыя семінары, праблемныя лабараторыі, мастацкія майстэрні) у форме часовых творчых калектываў, стварaемых пад перспектыўныя накірункі і канкрэтныя задачы;
- рупліўым пераглядзе набора спецыялізацый па якім вядзецца навучанне ў ВНУ, зыходзячы не толькі ад сённяшней сацыя-культурнай сітуацыі, але ў большай ступені заснаваных на навуковым прадбачэнні тэндэнцый далейшага функцыяніравання сацыя-культурнай сферы.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

Спецыфіка культуралагічнай адукацыі праяўляецца ў тым, што яна павінна не толькі адлюстроўваць, але і апераджаць сацыя-культурнае развіццё грамадства з тым, каб апошняе праз культуру мела магчымасць лепш падрыхтавацца да ўспрымання новых ідэй і грамадскіх адносін. Сучаснае пакаленне прыняе ў трэцем тысячагоддзі тыя каштоўнасці, якія навучальная ўстанова закладвае ў іх сення, а гэта патрабуе рэалізацыі прынцыпа апераджальнага развіцця.

Другая праблема, гэта ўваход Беларусі ў еўрапейскае і сусветнае супольніцтва. Кадры, якія мы рыхтуем, павінны быць канкурэнтна здольнымі і таму патрэбна арыентавацца на сусветныя адукацыйныя і прафесійныя стандарты.

Падрыхтоўка спецыялістаў у галіне культуры і вольнага часу павінна адпавядаць наступным крытэрыям:

1. Веданне гісторыі і этапаў развіцця прафесіі, звязанай з арганізацыяй мастацкай культуры, вольнага часу і адпачынкам.

2. Веданне тэорыі і філасофіі культуры вольнага часу і кіравання.

3. Веданне чалавечых і прыродных рэсурсаў і іх узаемаадносіны з вопытам арганізацыі вольнага часу.

4. Паніманне ўстаноў культуры і вольнага часу.

5. Веданне рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных законаў і актаў і іх уздзеянне на дзейнасць у галіне культуры і вольнага часу.

6. Веданне прыроды і відаў вольнага часу. Здольнасць аналізу дзейнасці ўдзельнікаў вольнага часу.

7. Веданне тэхнічных прыемаў забяспячэння вольнага часу.

8. Веданне механізму планавання адносна праграмы развіцця, уключаючы выяўленне аб'ектыўных прынцыпаў, выбар зместу дзейнасці, вызначэнне стратэгічных перспектыў, забяспячэнне патрабуемых рэсурсаў і распрацоўку даўгатэрміновых планаў.

9. Веданне і выкарыстанне вялікай колькасці прыемаў групавой і індывідуальнай дзейнасці ў сферы культуры і вольнага часу.

10. Асазнаванне адказнасці ўстаноў культуры, мастацтва і вольнага часу ў рабоце з інвалідамі і асобнымі групамі насельніцтва.

11. Магчымасць мяняць прыемы, канцэпцыі вольнага часу, якія

пазволяць прыняць удзел у дзейнасці асобных груп насельніцтва.

12. Веданне прынцыпаў і метадаў кіравання уключаючы:

12.1. арганізацыю;

12.2. планаванне;

12.3. маркецінг і прафесіины узрост;

12.4. фінансаванне;

12.5. грамадскія адносіны;

12.6. персанальную практыку і трудавыя адносіны;

12.7. дзелавую практыку;

12.8. прыняцце рашэнняў;

12.9. рашэнне праблем;

12.10. ацэнку;

12.11. фарміраванне сацыяльна-псіхалагічнага клімату у калектыве.

13. Веданне ролі і функцый адукацыі у галіне культуры вольнага часу, уключаючы філасофскія канцэпцыі.

14. Веданне целі асноўных працэсаў і узаемасувязь даследчай працы і кіравання у галіне культуры і вольнага часу.

15. Наяўнасць прафесійнага вопыту у арганізацыі, у галіне культуры і вольнага часу.

Улічваючы прад'яўляемыя патрабаванні, прадстаўляецца магчымым абгрунтаваць накірункі падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасці 0525 КУЛЬТУРАЛОГІЯ. У рамках гэтай спецыяльнасці неабходна весці падрыхтоўку па наступным спецыялізацыям:

- Арганізацыя сацыя-культурнай дзейнасці;
- Педагогіка сацыя-культурнай дзейнасці;
- Кіраванне і эканоміка (мэнеджмент) у сацыя-культурнай сферы;
- Фальклор і рэжысура святаў;
- Арганізацыя народных промыслаў і рамеслаў.

I. Спецыялізацыя "Арганізацыя сацыя-культурнай дзейнасці"

Кваліфікацыя: культуролаг-арганізатар дасуга.

Прафілізацыі:

1.1. Культуролаг-арганізатар мастацка-масавых праграм (сцэнарыст-пастаноўшчык).

1.2. Культуролаг-арганізатар відовішна-гульнёвага дасуга (гульня-тэхнік, крупʼе).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

I.3. Культуролаг-арганізатар турыстычна-экскурсійнага дасуга (экскурсавод-інструктар).

I.4. Культуролаг-арганізатар спартыўна-аздараўленчага дасуга (рэкрэолаг-метадыст).

I.5. Культуролаг-арганізатар экалагічнага руху (эколаг).

I.6. Культуролаг-арганізатар краязнаўчай і музейнай працы (краявед-музеявед).

2. Спецыялізацыя: "Педагогіка сацыя-культурнай дзейнасці".
Кваліфікацыя: сацыяльны педагог.
Прафілізацыі:
2.I. Аніматар дасуга дзяцей і падлеткаў.
2.2. Педагог сямейнага дасуга.
2.3. Педагог сацыяльнай рэлаксацыі.
2.4. Педагог-прававед сацыя-культурнай сферы.
2.5. Педагог-прававед сацыяльнай прафілактыкі.

3. Спецыялізацыя: "Фальклор і рэжысура святаў".
Кваліфікацыя: рэжысер святаў.
Прафілізацыі:
3.I. Рэжысер масавых святаў.
3.2. Рэжысер эстрады і цырка.
3.3. Рэжысер-распарадчык грамадзянскіх цырымоній і абрадаў.
3.4. Рэжысер-распарадчык сямейна-бытавых святаў і абрадаў.
3.5. Рэжысер фальклорных святаў і абрадаў (рэжысер-фалькларыст).

Улічваючы прад'яўляемыя патрабаванні і асноўныя напрамкі дзейнасці ў галіне вольнага часу неабходна весці падрыхтоўку мэнэджэраў.

Спецыялізацыя: "Мэнэджмент і эканоміка сацыя-культурнай сферы".

Кваліфікацыі:
1. Мэнэджэр-эканаміст устаноў культуры.
2. Мэнэджэр-эканаміст канцэртна-відовішчных праграм (імпрэсарыо).
3. Мэнэджэр-эканаміст кіна-відэа бізнэсу (прадзюсер).
4. Мэнэджэр-эканаміст у сферы турызма.
5. Мэнэджэр-эканаміст выставачнай і аукцыйнай дзейнасці.

У змест падрыхтоўкі плануецца увесці дысцыпліны, якія бу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дуць даваць магчымасць працаваць і па смежных спецыяльнасцях. Напрыклад, мэнэджэр-эканаміст канцэртна-відовішных праграм можа калі прыйдзецца па розных прычынах быць і сцэнарыстам-пастаноўшчыкам канцэртна-відовішных праграм. Мэнэджэр-эканаміст кіна-відэа бізнесу можа працаваць спецыялістам па рэкламе, метадыстам у кіна-відэа пракаце, мэнэджэр у сферы турызма – экскурсаводам-інструктарам і так далей.

Падрыхтоўка мэнэджэраў будзе ажыццяўляцца на 3 узроўнях:

1. Адміністрацыйны – на узроўні рэгіона (вобласць, раен, горад, метадычныя і кіраўнічыя структуры).

2. Кіраўнічы – на узроўні установ культуры (дырэктар, адміністратар).

3. Арганізацыйны – лідэр, арганізатар праграмы.

Дзеля высокаякаснай падрыхтоўкі спецыялістаў па гэтым кваліфікацыям неабходна прыняць у якасці прыярытэтнай такую мадэль адукацыі, якая была б пабудавана на метадалогіі і методыках, якія забяспечваюць фарміраванне незалежнага светапогляду і развіцце творчых магчымасцей асобы. На першым этапе на працягу 3-3,5 гадоў студэнт вывучае блок гуманітарных дысцыплін, забяспечваючых фундаментальную агульна-культурную і агульнапрафесійную падрыхтоўку і арыентуючых на нацыянальную культуру. Гэта традыцыйныя дысцыпліны вышэйшых школ свету: сусветная і нацыянальная гісторыі, літаратура, гісторыя філасофіі, логіка, рыторыка, гісторыя культуры, мастацкая культура Беларусі, замежная мова і г.д. Студэнту прадстаўляецца магчымасць удзелу у рабоце творчых семінараў, праблемных лабараторый, мастацкіх майстэрнях (не менш 3-х) з мэтай развіцця творчых і мастацкіх здольнасцей (літаратура, журналістыка, мастацкае мадэліраванне і г.д.).

У той жа час студэнт атрымлівае і фундаментальную прафесійную падрыхтоўку у межах спецыялізацыі па такім прадметам як: педагогіка і псіхалогія сацыя-культурнай дзейнасці, мэнэджмент, маркетінг, рэклама у сферы культуры, эканоміка і фінансаванне сацыя-культурных праграм, інфарматыка і вылічальная тэхніка, прававыя асновы кіравання, кіраванне у галіне культуры за мяжой і г.д.

З трэцяга курса студэнт па выніках прафесійнага тэсціра-

вання і асабістага выбару атрымлівае суму спецыялізаваных ведаў, умельстваў у рамках прапанаваных кваліфікацый для дзейнасці ў пэўных сферах, галінах сацыя-культурных устаноў.

Гэта прадметы:

1. Тэхналогія кіравання і эканоміка дзейнасці:

1.1. Клубных устаноў, паркаў, цэнтраў культуры і вольнага часу;

1.2. Музеяў, выставачных комплексаў;

1.3. Кіна-відэа цэнтраў, кінатэатраў, відэа-салонаў, праграм кабельнага тэлебачання;

1.4. Экскурсійна-турысцкіх комплексаў, санаторна-курортных і спартыўна-аздараўляльных устаноў.

2. Драматургія і сцэнарна-рэжысерскае забяспячэнне канцэртна-відовішчных праграм.

3. Мастацкае і музычнае афармленне канцэртна-відовішчных праграм.

4. Міравы і айчынны кінематограф - гісторыя і сучаснае становішча.

5. Драматургія і сцэнарнае забяспячэнне на кінатэлебачанне.

6. Турысцка-экскурсійная дзейнасць.

7. Рэкрэалогія і г.д.

Заканчваецца гэты этап навучання тэарэтычным даследваннем па першаму блоку дысцыплін і дыпломнай працай прыкладнога характару па даследванню канкрэтнага вопыту у рамках выбранай кваліфікацыі. Пройдзены курс адукацыі дае падставу для выдачы дыплома тыпа "бакалаўр".

Студэнты, праявіўшыя здольнасці да навуковай і навукова-творчай працы і вылучаныя кафедрамі і Саветам факультэта, працягваюць адукацыю ў магістратуры (асістэнтуры) па спецыялізацыі: "Мэнэджмент культуры" кваліфікацыя "мэнэджэр-сацыелаг культуры".

Каб атрымаць дыплом тыпа "магістр" неабходна вывучыць некалькі абавязковых (3-4) дысцыпліны і не меньш 5 дысцыплін на выбар. На гэтым этапе вельмі важны таксама спецкурсы і спецпрактыкумы па заяўкам студэнтаў або заказчыкаў, у даследванні тэарэтычнага і практычнага вопыту, а таксама авалоданне мовамі пасрэднікамі (рускай, англійскай або іншымі працоўнымі мовамі ААН).

Завяршаецца другі этап тэарэтычным даследваннем (рэферат) у рамках выбранай спецыялізацыі. Студэнтаў, атрымаўшых дыплом



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"магістра" можна рэкамендаваць для паступлення у аспірантуры, для працы выкладчыкамі ВНУ, у навукова-метадычных цэнтрах, органах кіравання культуры.

## ПСІХАЛАГІЧНЫ АНАЛІЗ АДНОСІН СТУДЭНТАЎ ДА РОДНАЙ МОВЫ

А.А.Амялькоў

Родная мова, з'яўляючыся носьбітам культуры, забяспечвае яе развіццё. Гэта аксіёма азначае, што развіццё нацыянальнай культуры пачынаецца з роднай мовы. Але, як сведчыць практыка, не ўсе студэнты інстытута культуры дасканала валодаюць беларускай мовай, па-рознаму адносяцца да яе. Выкладчыкі таксама разглядаюць праблему авалодання беларускай мовай па-рознаму. Сустракаюцца супрацоўнікі, якія ў гэтай праблеме на першае месца ставяць знешнія ўмовы і цяжкасці, асаблівасці свайго прадмета, або ставяцца да мовы з пазіцыі "традыцыйнай" для некаторых колаў на Беларусі "тэорыі зліцця моў і культур".

Мы не адмаўляемся ад знешніх умоў і ведаем, што ад іх многае залежыць. Але мы разумеем, што асноўнымі ўмовамі авалодання роднай мовай з'яўляюцца ўнутраныя, псіхалагічныя механізмы: адносіны студэнта да мовы, матывы яе вывучэння, узровень развіцця інтэлектуальнай, маральнай, эмацыянальнай, валявой сфер асобы і ўвогуле – узровень развіцця самасвядомасці студэнта.

У гэтым даследаванні мы паставілі мэту зрабіць псіхалагічны аналіз адносін студэнтаў да роднай мовы. Улічваючы, што адносіны – гэта ўнутраны, псіхалагічны кампанент ўзаемадзеяння чалавека з асяроддзем і вызначаюцца адчуваннямі і перажываннямі, якія могуць праяўляцца і рэалізавацца ў зносінах і сумеснай дзейнасці. Інакш кажучы, адносіны выражаюцца ў эмацыянальна афарбаваных думках асобы, а думкі не заўсёды поўнасцю выказваюцца услых. Студэнт можа адносіцца да роднай мовы станоўча, з вялікім гонарам за сваю радзіму, але выказваць адносіны, якія патрабуюць абставіны. З гэтай нагоды трэба зазначыць, што адносіны нельга назіраць, немагчыма іх вывучыць з дапамогай анкет ці апытання.

У адпаведнасці з мэтай і адзначанымі асаблівасцямі вывучэння адносін намі ставіліся наступныя задачы: І. зафіксаваць усе